ДА XXXII ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

# ДЗЕ ПАЧЫТАЦЬ ЗЕМЛЯКОЎ?

**СКІДЗЕЛЬ. Гарадская бібліятэка горада-спадарожніка (па вул. Клубная, 1 у ГДК) падрыхтавала выставу кніг землякоў з нагоды святкавання 6 і 7 верасня ў г. Ліда XXXII Дня беларускага пісьменства.**

У першы дзень працы выставы найбольшую цікаваць у наведвальнікаў бібліятэкі выклікалі кнігі, выдадзеныя па ініцыятыве актывістаў Гродзенскай раённай арганізацыі "Надзея" ГА "Беларускі саюз жанчын". У іх увайшлі аўтабіяграфічныя звесткі і нарысы многіх былых і сённяшніх жыхароў горада-спадарожніка. Назвы гэтых выданняў кажуць самі за сябе: "Голоса детей войны", "30 историй семей Гродненского района", "Кто есть кто", "Женшины Гродненщины: прошлое, настоящее, будущее".




Побач прадстаўлена ўнікальная калекцыя кніг скідзельскіх аўтараў, выдадзеных з пачатку 70-х да сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя. У прыватнасці, дакументальная аповесць Уладзіміра Верхася і Арона Гарэліка "Это было в Скиделе", два зборнікі нарысаў Мікалая Дзелянкоўскага "Красота рядом" і "Сяброўствы. Знаёмствы. Сустрэчы", кнігі Яўгена Крамко і Валерыя Санько "Нёманскія замалёўкі" і "Жыватворныя крыніцы", а таксама зборнік вершаў Уладзіміра Шурпы "Перазвон адліг".

На жаль, у бібліятэцы няма кніг самага славутага скідзельскага паэта Міхася Васілька. Затое захоўваецца важкая папка з копіямі яго публікацый і нарысамі аб ім у розных выданнях. Сучасная літаратурная Скідзельшчына на бібліятэчнай выставе прадстаўлена кнігамі паэзіі і публіцыстыкі Мікалая Сярова, Таццяны Савянковай, Тамары Мазур. А літаратурная

Гродзеншчына — творамі знакамітых гродзенскіх пісьменнікаў: Аляксея Карпюка, Уладзіміра Ягорычава, Людмілы Кебіч, Пятра Сямінскага, Ірыны Фамянковай, Віктара Кудлачова, Людмілы Шаўчэнкі, Віктара Саяпіна. Для тых, хто цікавіцца гісторыяй беларускай літаратуры, у першую чаргу настаўнікам і старшакласнікам, прадстаўлены кнігі літаратуразнаўчых артыкулаў Аляксея Пяткевіча: "Літаратурная Гродзеншчына" і "Слова і кніга Прынёмання".

Дадзеная выстава будзе працаваць увесь верасень. Таму некаторыя кнігі, якія сёння знаходзяцца на руках у чытачоў, будуць вяртацца на паліцы для іншых наведвальнікаў бібліятэкі.

Сардэчна запрашаем чытаць сваіх і ведаць сваё!

Скідзельская гарадская бібліятэка размяшчаецца ў раёне цукровага камбіната, па вул. Клубная, д. 1, у будынку гарадского Дома Культуры. Працуе з аўторка па суботу ўключна. Тэл. +375 29 575 02 78. Сардэчна запрашаем!

**Тамара МАЗУР**
член Саюза пісьменнікаў Беларусі,
бібліятэкар Скідзельскай гарадской бібліятэкі



